Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Рэктар універсітэта
_____ Н. У. Карчэўская
29.12 2025 г.
Рэгістрацыйны № ВД 6/25-50э/вуч.

МАЙСТЭРСТВА ВЯДУЧАГА

Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі
па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці
6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят

2025

Вучэбная праграма складзена на падставе адукацыйнага стандарту агульнай вышэйшай адукацыі па спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят, зацверджанага пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь 21.08.2023 №270; вучэбнага плана па спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят

СКЛАДАЛЬНІК:

У. А. Трапянок, дацэнт кафедры рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТЫ:

Н. Я. Гальпяровіч, спецыяльны карэспандэнт Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь;

І. А. Алексніна, загадчык кафедры тэатральнай творчасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт.

РЕКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

кафедрай рэжысуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 3 ад 12.11.2025)

прэзідыумам навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 2 ад 20.12.2025)

ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Майстэрства вядучага» уключана ў модуль «Моўнае дзеянне ў свяце».

Правільнае маўленне, уменне ўпэўнена і арганічна трымацца на сцэнічнай пляцоўцы, у студыі з'яўляюцца індыкатарам прафесіяналізму вядучага, узроўню яго майстэрства, здольнасці ўздзейнічаць на свядомасць іншых людзей. Слова, прамоўленае са сцэны ці праз мікрафон і скіраванае на пэўную аўдыторыю, набывае асаблівую значнасць з боку прамоўцы. Аратар (вядучы) падчас публічных выступленняў дзеліцца сваімі інтэлектуальнымі (ведамі, вопытам, каштоўнасцямі, перакананнямі), фізічнымі (сілай голасу, тэмбрам), псіхаэмацыянальнымі ўласцівасцямі (настрой, эмоцыі), уплывае на аўдыторыю, адказвае за даступнасць прамоўленага. У выніку ў рэцыпіентаў фарміруецца ўспрыняцце і разуменне сэнсавай і эмацыянальнай цэласнасці, зладжанасці праграмы (канцэрта, вечара, перадачы і г. д.), яе напоўненасці, лагічнасці і завершанасці.

Вучэбная дысцыпліна «Майстэрства вядучага» ўваходзіць у лік спецыяльных дысцыплін, неабходных высокакваліфікаваным спецыялістам у авалоданні прафесіі рэжысёра. Значнасць спасціжэння навыкаў дысцыпліны заключаецца ў разуменні і практычным прымяненні на сцэнічнай пляцоўцы, у вучэбнай аўдыторыі, падчас працы ў студыі, перад мікрафонам у іншых абставінах неабходных ведаў і ўменняў валодання арфаэпічнымі нормамі, законамі логікі мовы і маўлення, уласным голасам, мімікай, целам, а таксама ступенню непасрэднага кантакта з аўдыторыяй, эмацыянальнага ўздзеяння на яе. Вучэбная дысцыпліна «Майстэрства вядучага» дапамагае засвоіць законы прамоўніцкага майстэрства, арганічнага самаадчування падчас публічнага выступлення. Працэс навучання па дысцыпліне прадугледжвае комплексны падыход у развіцці індывідуальных здольнасцей кожнага студэнта, пашырэння творчых магчымасцей і практычных навыкаў будучых спецыялістаў. Дысцыпліна заклікана ўзбагаціць выканальніцкую прыроду рэжысёраў.

Узаемасувязь дадзенай вучэбнай дысцыпліны з вучэбнымі дысцыплінамі «Тэхніка маўлення», «Моўнае дзеянне», «Асновы дыктарскага майстэрства», стварае создает спрыяльныя ўмовы для паслядоўнага паглыблення прафесійных кампетэнцый студэнтаў на працягу ўсяго навучання.

Галоўнай *мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага» з'яўляецца перадача ведаў аб асаблівасцях прафесіі вядучага, замацаванне практычных навыкаў арганічнага існавання ў якасці распарадчыка разнастайных культурных мерапрыемстваў і медыяпраектаў.

Дасягненне мэты ажыццяўляецца падчас рэалізацыі наступных задач:

– авалодванне арфаэпічнымі нормамі літаратурнай беларускай і рускай моў;

– вывучэнне і развіццё галасавых асаблівасцей;

– засваенне асноў стылістычнай рэдактуры;

– веданне законаў аратарскага майстэрства і механізмаў уздзеяння на аўдыторыю;

– засваенне практычных навыкаў вядзення разнастайных праграм самастойна і з партнёрам, з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў;

– удасканаленне невербальных сродкаў зносін (міміка, жэсты, погляд, рухі цела і г. д.) у спалучэнні з маўленнем;

– фарміраванне ўласнага стылю вядучага.

У выніку студэнты павінны *ведаць*:

– законы логікі сцэнічнага маўлення;

– арфаэпічныя нормы літаратурнай мовы;

– асноўныя характарыстыкі голасу;

– базавыя стылістычныя правілы рэдагавання тэкстаў для агучвання;

– віды канферансу і прафесійныя якасці канферансье, падабенствы і адрозненні канферансье і вядучага;

– жанры размоўных перадач у СМІ;

– асаблівасці працы з мікрафонам.

Студэнт павінен *умець*:

– карыстацца сваім голасам;

– самастойна пісаць і рэдагаваць тэксты і сцэнарыі;

– выразна, лагічна, пераканаўча агучваць тэксты, што маюцца, «прысвойваць» іх;

– працаваць з мікрафонам;

– вызначаць настрой аўдыторыі і трансфармаваць яго ў залежнасці ад задач праграмы;

– эмацыянальна ўздзейнічаць на аўдыторыю, прымушаць яе думаць, весці за сабой.

Студэнт павінен *мець навык:*

– валодання практыкай «галасавога масажу» і разагрэву маўленчага апарата і цела;

– валодання навыкамі пошуку неабходнай інфармацыі па выбранай тэме, умела выкарыстоўваць яе падчас напісання сцэнарыя;

– валодання законамі публічнага сольнага, парнага, групавога выступлення.

Авалодванне зместам вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага» накіравана на фарміраванне *базавай прафесійнай кампетэнцыі*:

– выкарыстоўваць навыкі рэжысуры і выканальніцкага майстэрства акцёра, прымяняць разнастайныя сродкі мастацкай выразнасці ў працэсе стварэння розных відаў свята;

спецыялізаванай кампетэнцыі:

– прымяняць метады карэктыроўкі моўных абаблівасцей і галасавых дадзеных у прафесійных дзейнасці.

Адукацыйны працэс па дысцыпліне «Майстэрства вядучага» накіраваны не толькі на набыццё студэнтамі тэарэтычных ведаў, практычных уменняў і навыкаў па прафесіі рэжысёра, але і на развіццё творчага патэнцыялу, каштоўнасна-сэнсавых арыентацый, духоўна-асабовых якасцей, а таксама на фарміраванне светапоглядной пазіцыі, крэатыўнага мыслення, грамадзянска-патрыятычных якасцей асобы, гатовай да актыўнага ўдзелу ў эканамічным, сацыяльна-культурным і грамадскім жыцці краіны.

Вучэбным планам па вывучэнні дысцыпліны «Майстэрства вядучага» ўсяго прадугледжана 180 гадзіны, у тым ліку 88 гадзін аўдыторных заняткаў. Прыкладнае размеркаванне аўдыторных гадзін па відах заняткаў: лекцыі – 18 гадзін, практычныя заняткі – 62 гадзіны, індывідуальныя заняткі – 8 гадзін.

Для студэнтаў завочнай формы атрымання адукацыі прадугледжана 180 гадзін, з якіх 22 гадзіны аўдыторныя заняткі (з іх: лекцыі 4 гадзіны, практычныя заняткі – 16 гадзін і індывідуальных – 2 гадзіны).

Рэкамендаваная форма бягучай атэстацыі – стварэнне творчага праекта. Рэкамендаваная форма прамежкавай атэстацыі – экзамен. Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 4 заліковыя адзінкі.

ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Уводзіны.
Змест і значэнне вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага»

Мэта і задачы вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага». Месца дысцыпліны ў сістэме профільных прадметаў, запатрабаванасць і значнасць прафесіі вядучага.

Аб'ём, задачы і структура вучэбнай дысцыпліны. Характарыстыка раздзелаў, практычная скіраванасць дысцыпліны. Паняцці «публічнае выступленне», «аўдыторыя», «праца з мікрафонам», «псіхалагічнае ўздзеянне», «інтанацыйная выразнасць», «арфаэпічныя нормы» і інш. Адказнасць самастойнай працы студэнтаў падчас авалодвання дысцыпліны.

Рэкамендаваныя літаратура, аўдыя- і відэаматэрыялы.

Тэма 1. Кіраванне дыханнем і голасам. Арфаэпічная і інтанацыйная выразнасць. Культура і логіка маўлення падчас публічнага выступлення

Падрыхтоўка галасавога апарата да працы. Валоданне нормамі арфаэпіі рускай і беларускай моў – правільнае вымаўленне гукаў, гукавых спалучэнняў. Цяжкасці двухмоўя, мелодыка маўлення, палётнасць гуку, галасавы пасыл у залежнасці ад умоў працы вядучага.

Замацаванне законаў логікі маўлення – маўленчыя такты, дакладны аб'ект, галоўнае і другаснае ў тэксце, вызначэнне паўз, лагічных цэнтраў і націскаў. Тэмпарытм вядучага канцэртнай праграмы, перадачы на радыё і тэлебачанні ў залежнасці ад яе жанру. Фразеалагізмы, метафары, гіпербалы, сінонімы, жаргоны, дыялекты, «крылатыя выразы», моўныя штампы, агаворкі, слэнг у мове вядучага. Эрудыцыя вядучага як гарант свабоды і лёгкасці падчас публічнага выступлення ці імправізацыі.

Цела вядучага – поза, жэсты, натуральнасць мімікі, позірк, уменне рухацца па сцэне. Знешні выгляд (касцюм, прычоска, грым, «праблема рук»), індывідуальнасць вядучага.

Тэма 2. Спецыфіка сцэнарнага майстэрства і роля вядучага ў падрыхтоўцы тэкстаў

Агульныя паняцці драматургіі – задума, тэма, ідэя, фабула, сюжэт, жанр, дзеянне, характар, канфлікт. Стылі тэксту – навуковы, афіцыйна-справавы, публіцыстычны, мастацкі, размоўны. Выбар аптымальнага стылю

для напісання ўласнага сцэнарыя ў залежнасці ад канцэпцыі культурнай праграмы. Інструменты, правілы і прыёмы стварэння сцэнарыяў. Асновы сцэнарнага майстэрства. Сцэнарый як літаратурна-драматургічны твор – літаратурны сцэнарый, рэжысёрскі сцэнарый, рэжысёрская эксплікацыя. Завязка, кульмінацыя і развязка ў тэксце.

Сцэнарый і сцэнарны план на радыё і тэлебачанні. Выбар тэмы, задума, мэта праекта, генерацыя ідэй і іх фільтрацыя, распрацоўка канцэпцыі. Напісанне сцэнарыя – уласны тэкст, тэкст з выкарыстаннем існуючых крыніц, матэрыялаў па тэме.

Тэма 3. Рэдагаванне тэкстаў

Знаёмства з паняццямі «літаратурнае рэдагаванне» (выпраўленне лексічных, марфалагічных, сінтаксічных, стылістычных памылак; пры гэтым аўтарскі стыль захоўваецца), «сэнсавае рэдагаванне» (вызначэнне будучай структуры тэксту, пасля – сэнсавае рэдагаванне згодна з выбранай структурай), «стылістычнае рэдагаванне» (прывядзенне аўтарскага тэксту да адзінага стылю), «навуковае рэгаваннне» (спецыфічнае рэдагаванне, якое прадугледжвае працу навуковага рэдактара), «мастацкае рэдагаванне» (мастацкае афармленне тэксту, якое садзейнічае інтарэсу да невядомага аўдыторыі твора).

Спецыфіка рэдагавання тэкстаў для агучвання. Эмацыянальнасць і аўтарская падача пры агучванні тэксту, пражыванне, «прысваенне» чужых тэкстаў. Значэнне паняцця «кінастужка бачання» ў працы вядучага.

Тэма 4. Майстэрства канферансье

Законы творчасці на эстрадзе. Узнікненне жанру канферансье. Славутыя прастаўнікі канферансу. Віды канферансу – індывідуальны, парны (дуэтны), тэатралізаваны, эстафетны (канферанс без канферансье).

Асоба канферансье і яго стылістыка працы – задачы падчас выхаду на пляцоўку (забаўляць, інфармаваць, весяліць, запаўняць паўзы і г.д.), уласная творчасць (акцёрскае майстэрства, нумар у праграме, імправізацыя), сцэнічны вобраз (маска, дасціпнасць, адукаванасць), маўленчыя асаблівасці, цесная сувязь з аўдыторыяй, партнёрамі, тэмперамент, узбуджальнасць, захопленасць. Элементы канферансу – рэпрызы, выступленне, анансаванне, уласны нумар і інш.

Пошук уласнага стылю канферансье (стварэнне маскі), драматургія ў будове вядзення канцэрта. Разбурэнне «чацвёртай» сцяны.

Тэма 5. Мастацтва вядучага канцэртных праграм

Зараджэнне прафесіі і прызначэнне. Славутыя імёны і іх майстэрства. Спецыфіка працы вядучых у розныя перыяды (XX–XXI стст.). Сучасны вобраз вядучага. Адрозненне вядучага ад канферансье: асноўная задача – інфармаваць, праца ў прапанаваных абставінах, прыемны голас, дакладная дыкцыя, знешні выгляд, унутраная ўвага, сувязь з іншымі творчымі прафесіямі і інш.

Вядзенне праграмы, кантактаванне з залай, элементы імправізацыі, творчае мысленне і непрадказальныя абставіны, праца па-за сцэнічнай пляцоўкай (прадстаўленне нумароў за кулісамі). Асаблівасці вербальнага і невербальнага ўздзеяння на аўдыторыю, «кінастужка бачання» падчас агучвання тэкстаў, падтэксты, тон, добразычлівасць.

Тэма 6. Трансфармацыя вобраза вядучага

Знаёмства з відамі (філарманічная, літаратурная, эстрадная) і жанрамі (філарманічны, эстрадны) канцэртнай творчасці. Разнавіднасці канцэртнай праграмы – сольны канцэрт, зборны канцэрт, тэатралізаваны канцэрт, дзіцячы канцэрт, канцэрт-спектакль. Спецыфіка працы вядучага канцэртаў.

Прафесійныя якасці вядучага – урачыстасць і засяроджанасць, стрыманасць паводзін і жэстаў, правільная поза, веданне нумароў, сканцэнтраванасць і лаканічнасць у прадстаўленні нумароў, роля «гаспадара» на сцэне, даверлівыя адносіны з залай, асаблівасці паводзін і падачы тэкстаў у залежнасці ад узроставых катэгорый гледачоў, баланс ігры і арганічных, натуральных паводзін, знешні выгляд, асаблівасці галасавой падачы, даверлівасць інтанацый, эмацыянальнае ўздзеянне. Рашэнне «праблемы рук» праз выкарыстанне папкі, планшэта, гаджэтаў.

Вядзенне відовішчных, забаўляльных, праграм адпачынку. Вядучы маладзёжных і дзіцячых праграм.

Вядзенне праграм на адкрытым паветры. Стварэнне вобраза вядучага на аснове міфалагічнага, фальклорнага, літаратурнага, кінематаграфічнага і іншага матэрыялу.

Вядучы-інфарматар, вядучы-каментатар, вядучы-акцёр, вядучы-правакатар, вядучы-арганізатар.

Спалучэнне інфармацыйна-лагічнага (інфармацыйнае ўздзеянне на аўдыторыю) і мастацка-вобразнага (пачуццёвага) уздзеяння на аўдыторыю.

Тэма 7. Майстэрства вядучага на радыё і тэлебачанні. Закадравае агучванне

Гісторыя жанраў, іх функцыі, кампазіцыйныя і стылістычныя асаблівасці, магчымасці гукавога афармлення перадач, асаблівасці мантажу. Знаёмства з інфармацыйнымі жанрамі (нататка, інтэрв'ю, рэпартаж). Асаблівасці падрыхтоўкі і стварэння інфармацыйных матэрыялаў. Разнастайнасць аналітычных жанраў (каментарый, глоса, бяседа, шоу, агляд, рэцэнзія), удзел вядучага. Значэнне і роля вядучага (выканаўцы) у дакументальна-мастацкіх жанрах (публіцыстыка, нарыс, кампазіцыя, радыёфільм, пастановачнае вяшчанне).

Асноўныя тыпажы і рысы вядучых у тэлеэфіры. Тыпажы вобраза вядучага: «вядучы-гаспадар», «вядучы-артыст», «вядучы-выдатнік», «вядучы-спадзвіжнік» і інш. Вядучы-дыктар: майстэрства асабістай падачы абязлічанай інфармацыі. Вядучы-суразмоўца: майстэрства расстаноўкі акцэнтаў, уменне стварыць даверлівую абстаноўку. Вядучы-публіцыст: майстэрства найбольшага ўздзеяння на аўдыторыю, уменне падзяліцца ўласнай ацэнкай рэчаіснасці. Вядучы ток-шоу: дзейсны пасрэднік паміж прадстаўнікамі розных сацыяльных груп, спецыялістамі. Прыёмы падрыхтоўкі суразмоўцаў да эфіру, «разгаворванне» іх.

Артыстычнасць як абавязковая якасць вядучых забаўляльных перадач. Эмацыянальнасць вядучых. Часавыя абставіны ў дзейнасці вядучых (ранішнія, дзённыя, вячэрнія, начныя праекты). Атака голасу, тэмбральная афарбоўка, дыкцыя, мелодыка маўлення перад мікрафонам. Здольнасць чуць суразмоўцу, партнёра, значэнне ацэнак і жывых рэакцыі.

Тэма 8. Праца вядучага з тэхнічнымі сродкамі

Мікрафон як дапаможны сродак у працы вядучага. Асаблівасці працы з мікрафонам – дыханне, галасавая падача (сіла гуку на апоры і яго роўнасць), праца з целам, заціскі і іх зняцце, падрыхтоўка маўленчага апарата да дзейнасці з мікрафонам, запіс, прамы эфір. Супраца з гукарэжысёрам.

Віды мікрафонаў – стацыянарныя, падвесныя, радыёмікрафон, пятлічка. Баланс моцы гуку ў памяшканнях розных памераў і на адкрытай пляцоўцы. Адлегласць паміж мікрафонам і вуснамі як гарант чысціні гучання. Практычныя рэкамендацыі знешніх паводзін у студыі гуказапісу для чысціні эфіру. Індывідуальнасць падчас працы з мікрафонам.

Імітацыя голасу падчас запісаў. Спецыфіка агучвання дакументальных матэрыялаў, запісу музычна-паэтычных кампазіцый, рэкламы, аўдыякніг,

твораў для дзяцей, удзел у радыёспектаклі, агучванні дакументальных фільмаў і г.д. Звычка карыстацца мікрафонам.

Тэма 9. Псіхаэмацыянальнае ўздзеянне на аўдыторыю

Знаёмства з аўдыторыяй і падрыхтоўка да выступлення як важны спосаб уздзеяння на гледача. «Перадстартавы рытуал» – размінка, уласны разагрэў перад выхадам на сцэну. Унутранае хваляванне і спосабы спраўляцца з ім. Правілы авалодвання ўвагай аўдыторыі. Фізічны, энергетычны, эмацыянальны і псіхалагічны кантроль аўдыторыі. Чаргаванне эмоцый і фізічнага стану аўдыторыі. Правакаванне аўдыторыі (стварэнне эмацыянальных накалаў, выкарыстанне паўз, захаванне эмацыянальнай устойлівасці і г.д.). Тэмперамент, энергетыка і эмацыянальнасць вядучага. Гатоўнасць да магчымых «паваротаў» глядзельнай залы, навыкі імправізацыі. Знешнія элементы прафесійнага ўздзеяння вядучага (касцюм, міміка, жэсты). Мера і густ, такт і культура, адказнасць вядучага.

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Дзённая форма навучання

Нумар раздзела, тэмы	Назва раздзела, тэмы	Колькасць аўдыторных гадзін			Колькасць гадзін УСР	Форма контролю ведаў
		Лекцыі	Практычныя	Індывідуальныя		
1.	Уводзіны. Змест і значэнне вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага»	2				
2.	Тэма 1. Кіраванне дыханнем і голасам. Арфаэпічная і інтанацыйная выразнасць. Культура і логіка маўлення падчас публічнага выступлення		4	1	2	апытанне
3.	Тэма 2. Спецыфіка сцэнарнага майстэрства і роля вядучага ў падрыхтоўцы тэкстаў		2		2	апытанне
4.	Тэма 3. Рэдагаванне тэкстаў	2	2	1	2	творчы праект
5.	Тэма 4. Майстэрства канферансье	2	6	1	2	творчы праект
6.	Тэма 5. Мастацтва вядучага канцэртных праграм	2	6	1	2	творчы праект
7.	Тэма 6. Трансфармацыя вобраза вядучага	2	6		2	апытанне
8.	Тэма 7. Майстэрства вядучага на радыё і тэлебачанні. Закадравае агучванне	2	6	1	2	творчы праект
9.	Тэма 8. Праца вядучага з тэхнічнымі сродкамі	2	6	1	2	творчы праект
10.	Тэма 9. Псіхаэмацыянальнае ўздзеянне на аўдыторыю		4		2	апытанне
	Усяго	**14**	**50**	**6**	**18**	

ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

Завочная форма навучання

Номер раздела, темы	Название раздела, темы	Количество аудиторных часов			Количество часов для самостоятельного изучения учебного материала
		Лекции	Практычныя	Индивидуальные	
1.	Уводзіны. Змест і значэнне вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага»				2
2.	Тэма 1. Кіраванне дыханнем і голасам. Арфаэпічная і інтанацыйная выразнасць. Культура і логіка маўлення падчас публічнага выступлення	2			20
3.	Тэма 2. Спецыфіка сцэнарнага майстэрства і роля вядучага ў падрыхтоўцы тэкстаў	2			20
4.	Тэма 3. Рэдагаванне тэкстаў		2		20
5.	Тэма 4. Майстэрства канферансье		2	1	20
6.	Тэма 5. Мастацтва вядучага канцэртных праграм		2		20
7.	Тэма 6. Трансфармацыя вобраза вядучага		2		20
8.	Тэма 7. Майстэрства вядучага на радыё і тэлебачанні. Закадравае агучванне		2	1	20
9.	Тэма 8. Праца вядучага з тэхнічнымі сродкамі		2		20
10.	Тэма 9. Псіхаэмацыянальнае ўздзеянне на аўдыторыю		2		18
Усяго		**4**	**16**	**2**	**180**

ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Літаратура

Асноўная

1. *Авяркова,* Н. К. Слоўнае дзеянне ў святе : вучэбна-метадычны дапаможнік / Н. К. Авяркова. – 2-е выд., са змян. – Мінск : БДУКМ, 2023. – 72 с.

2. *Петрова,* А. Н. Искусство речи / А. Н. Петрова. – М. : Издательство АСТ, 2023. – 448 с.

3. *Трапянок,* У. А. Майстэрства вядучага : вучэбна-метадычны дапаможнік для спецыяльнасці 6-05-0215-04 Рэжысура прадстаўленняў і свят, прафілізацыі «Рэжысура сучасных відовішчаў і івент-праектаў» і «Рэжысура народных абрадаў і свят». – Мінск : БДУКМ, 2025. – 137 с.

Дадатковая

1. Каляда, А. А. Гаворка беларуская. Разговор русский : дыкцыя і арфаэпія : з электронным дадаткам / А. А. Каляда. – Мінск : Вышэйшая школа, 2020. – 215 с.

2. Жукова, А. М. Формирование музыкально-постановочной компетенции у режиссеров театрализованных представлений и праздников: монография / А. М. Жукова, О. А. Овсянникова. – Санкт-Петербург [и др.] : Москва : Лань, 2019. – 147 с.

3. Котюрова, М. П. Культура научной речи: текст и его редактирование: учебное пособие для студентов вузов, обучающихся по направлению 540300 – «Филологическое образование» / М. П. Котюрова, Е. А. Баженова. – 6-е изд., стереотипное. – Москва : Флинта : Наука, 2018. – 279 с.

4. Мордасов, А. А. Принципы режиссуры театрализованных представлений и праздников: учебное пособие / А. А. Мордасов. – Изд. 4-е, стереотипное. – Санкт-Петербург [и др.] : Лань, Планета музыки, 2020. – 125 с.

5. Мурашов, А. А. Современная риторика: речевое воздействие и взаимодействие: монография / А. А. Мурашов. – Гродно : ГрГУ, 2012. – 286 с.

Рэкамендаваныя метады навучання

Інструментарый выкладчыка дысцыпліны прадугледжвае выкарыстанне такіх педагагічных метадаў навучання, як:

– метады вуснага выкладу матэрыялу і актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці навучэнцаў (аповед, тлумачэнне, лекцыя, бяседа);

– метады самастойнай працы студэнтаў па асэнсаванні і засваенні новага матэрыялу: праца з літаратурай, практычныя заняткі;

– гульнявы метад (у дзелавых і ролевых гульнях);

– аўдыяльныя і візуальныя метады (праслухоўванні, ілюстрацыі, дэманстрацыі, відэаматэрыялы).

Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай працы студэнтаў

Самастойная праца студэнтаў накіравана на ўзбагачэнне іх ведаў, уменняў і навыкаў па вучэбнай дысцыпліне «Майстэрства вядучага». Мэта самастойнай працы студэнтаў – садзейнічанне засваенню зместу вучэбнай дысцыпліны ў поўным аб'ёме праз сістэматызацыю, планаванне і кантроль.

Самастойная работа студэнтаў па тэмах вучэбнай дысцыпліны ажыццяўляецца ў форме прагляду і праслухоўвання запісаў культурных мерапрыемстваў, праграм і іх самастойнага аналізу, стварэння аўтарскіх праектаў.

Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі

Для кантролю за авалоданнем студэнтамі вучэбнага матэрыялу выкарыстоўваюцца метады вуснай дыягностыкі ведаў (апытанне); метады практычнай дыягностыкі (стварэнне самастойных творчых праектаў).

Дыягностыка кампетэнцый студэнтаў ажыццяўляецца пры дапамозе:

– апытанняў падчас практычных заняткаў;

– стварэння студэнтамі і абароны ўласных творчых праектаў.

Для выніковай дыягностыкі ўзроўню ведаў, уменняў і навыкаў студэнтаў, атрыманых у працэсе засваення вучэбнай дысцыпліны «Майстэрства вядучага», праводзіцца экзамен.